Библиотека
АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН БАРАНАВІЦКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 7 (208) Серада, 26 студзеня 1944 г.

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

**Войска Ленинградского фронта, развивая наступление, в ночь на 26 января штурмом овладели городом и крупным железнодорожным узлом ГАТЧИНО (Красногвардейск).**

СЕГОДНЯ СТОЛИЦА НАШЕЙ РОДИНЫ МОСКВА СОЛЮТОВАЛА ДОБЛЕСТНЫМ ВОИНАМ, ОСВОБОДИВШИМ ГАТЧИНО, 12 АРТИЛЛЕРИЙСКИМИ ЗАЛПАМИ ИЗ 124 ОРУДИЙ.

## ПРЕЗРЕНИЕ И СМЕРТЬ ФАШИСТСКИМ ХОЛУЯМ!

Красная Армия победоносно движется на запад. Под ее мощными ударами, как весной снег, тают немецко-фашистские орды. Дивизии советских войск уже ведут бои в западных областях Украины. Они заняли Сарны и рад районных центров Ровенской области. В Белоруссии доблестная Красная Армия освободила областные города Гомель и Мозырь, почти всю Гомельскую и большую часть Полесской области. Она находится у стен Витебска, на подступах к Полоцку, Орше, Могилеву.

Войска Ленинградского фронта отогнали немцев от славного города Ленина и продолжают успешное наступление.

Близится час освобождения от немецких захватчиков, час расплаты за все пережитое. За все свои злодеяния ответят фашистские мерзавцы. А с ними вместе понесут ответ и те, кто помогает немцам в их грабительских действиях, кто, изменив своему народу, служит немцу.

Но среди полицейских, солдат и офицеров так называемых «украинских» батальонов, эсэсовских и прочих немецко-фашистских формирований, запятнавших себя и свои семьи позорным пятном предательства, есть люди, которые под страхом смерти, обманом и шантажем втянуты в фашистские сети. Им мы говорим сегодня прямо: став на службу к немцу, они совершили тяжелое преступление. Однако, они могут еще смыть с себя позор предательства. Для этого должны немедленно с оружием перейти к партизанам.

Сейчас немцы в нашей Барановичской области проводят «тотальную» мобилизацию населения. Они хотят угнать белорусов либо на страшную немецкую каторгу, либо на фронт, воевать против родной Красной Армии. Они хотят толкнуть белорусов на предательство и братоубийство.

Задача всех честных людей, всего населения — всеми средствами срывать эту мобилизацию, не являться на призывные комиссии. Если же кого немцам удалось насильно схватить, то его родные, его знакомые должны ему подсказать: не вступай на путь фашистского халуя, не подымай руки против своих родных братьев, а получив оружие немедленно уходи к партизанам.

Граждане и гражданки! Если кто либо из ваших родных или близких знакомых еще служит у немца — напомните ему, чтобы он немедленно уходил с гибельного пути, чтобы он немедленно поворачивал оружие против немецких оккупантов и немецкой кровью смывал позор предательства с себя и своей семьи. Того, кто будет продолжать служить немцу, продолжать лизать фашистские пяты, кто будет помогать немцам угонять наших людей на немецкую каторгу — презирайте на каждом шагу.

Презрение и смерть фашистским холуям!

Смерть немецким оккупантам!

## ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ РАЗВІВАЕ НАСТУПЛЕННЕ

(З аператыўных зводак Совінформбюро з 22 па 25 студзеня 1944 года).

Авалодаўшы гарадамі Краснае Сяло і Мга, войскі Ленінградскага фронта прадаўжалі развіваць наступленне. Наступаючы на захад і поўдзень ад Краснага Сяла, войскі фронта занялі з 22 па 25 студзеня звыш 110 насельных пунктаў, сярод іх гарады ПУШКІН (Царскае Сяло), ПАЎЛАЎСК (Слуцк) і перарэзалі чыгунку Гатчына—Нарва. 25 студзеня нашы часці ўшчыльную падышлі да гор. Гатчына (Краснагвардзейск) і завязалі баі на акраінах горада.

На поўнач і паўночны ўсход ад Тосна, на захад і паўднёвы захад ад Кірышы нашы войскі занялі з 22 па 25 студзеня больш 70 насельных пунктаў. У рэзультаце рашучай атакі нашы войскі ліквідавалі плацдарм немцаў на ўсходнім беразе ракі Волхаў у раёне Грузіно і поўнасцю ачысцілі ад немцаў чыгунку Кірышы—Мга—Ленінград. 25 студзеня часці Чырвонай Арміі ў радзе месц падышлі да чыгуначнай лініі Чудава—Тосна.

На захад ад Ноўгарада нашы войскі поўнасцю ліквідавалі разрозненыя групы праціўніка, акружаныя ў лясах на захад ад горада. Прадаўжаючы развіваць наступленне на захад, паўночны захад і паўднёвы захад ад Ноўгарада, нашы часці з 22 па 25 студзеня вызвалілі ад немцаў больш 40 насельных пунктаў.

Войскі Беларускага фронта, наступаючы на захад ад Калінкавіч і Мазыра занялі рад населеных пунктаў і сярод іх раённыя цэнтры Палескай вобласці АЗАРИЧЫ і ЛЕЛЬЧЫЦЫ.

На ўсход ад Вініцы і на поўнач ад Хрысцінаўкі нашы войскі паспяхова адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка і нанеслі яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

На другіх участках фронта — разведка, артылерыйска-мінамётная перастрэлка і ў радзе пунктаў — баі мясцовага значэння.

# ПАРТЫЗАНЫ БАРАНАВІЦКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗНІШЧАЮЦЬ НЯМЕЦКІХ АКУПАНТАЎ І ІХ ТЭХНІКУ

## На чыгунцы

Група партызан-падрыўнікоў атрада імені Варашылава пад кіраўніцтвам камандзіра аддзялення Я. арганізавала крушэнне нямецкага цягніка з войскам. У рэзультаце крушэння разбіта 6 вагонаў і 3 другіх пашкоджана. Як пасля высветлілася, з пад абломкаў цягніка было выбрана каля 200 трупаў гітлераўцаў. 101 гітлеравец паранены.

## З засады

Падраздзяленне партызанскага атрада імені Жданава пад кіраўніцтвам камісара Д. Д. зрабіла засаду на шасейнай дарозе. Неўзабаве да месца засады падыйшла аўтакалона з 16 машын з нямецкім войскам, якую суправаджала адна бронемашына. Партызаны, падпусціўшы машыны ўплатную, адкрылі дружны агонь. 2 аўтамашыны тут-жа згарэлі і адна была пашкоджана. Пры абстрэле калоны партызаны забілі 12 і паранілі 7 немцаў.

## Мінай

Партызаны атрада імені Суворава, якім камандуе Фёдар С., замініравалі дарогу між двумя нямецкімі гарнізонамі. На міну наляцела нямецкая грузавая аўтамашына з салдатамі. Пры ўзрыве забіта 6 і ранена 12 салдат і афіцэраў.

## За месяц

Партызаны атрада імені Будзённага за снежань 1943 года на шасейных і грунтавых дарогах на мінах узарвалі 7 нямецкіх аўтамашын, пры ўзрывах забіта 78 і паранена 98 гітлероўцаў.

# ЗА ГРАНИЦЕЙ

## Собрание в Стокгольме, посвященное памяти В. И. Ленина

Шведское общество культурной связи с Советским Союзом устроило в большом зале Народного Дома в Стокгольме собрание, посвященное 20-ти летию со дня смерти В. И. Ленина. Вице-председатель общества д-р Ара Нильссон в своем выступлении выразила от имени собравшихся особое восхищение победоносными действиями Красной Армии на Ленинградском фронте у города, который носит имя Ленина.

Известный датский писатель Мартин Андерсен Нексе выступил с большим докладом о жизни и деятельности В. И. Ленина.

## *Действия авиации союзников*

В ночь на 24 января бомбардировщики «Москито» атаковали об'екты в западной Германии.

Вечером 23 января несколько сот самолётов союзников возобновили бомбардировку об'ектов в северной Франции. В этих операциях учавствовали свыше 200 американских бомбардировщиков.

Крупные соединения бомбардировщиков, пересекшие Ла-Манш, во второй половине дня сбросили около 300 тонн бомб на военные об'екты в районе Па-де-Кале. Вслед за этой операцией самолёты «Спитфайр», пилотируемые норвежскими летчиками, совершили штурмовой налет на район Амьена.

## 2300 ТОНН БОМБ НА БЕРЛИН

Английское министерство информации сообщает, что налет английских бомбардировщиков на Берлин в ночь на 21 января был весьма концентрированным. Крупные соединения четырехмоторных английских бомбардировщиков сбросили на Берлин в течение 30 минут свыше 2300 тонн бомб.

## Десант союзников южнее Рима

Главная ставка войск союзников в Италии сообщает, что в районе плацдарма, созданного союзниками южнее Рима, непрерывными потоками прибывают американские и английские войска и материалы. На этом участке фронта противник не оказал эффективного сопротивления.

Город Неттуно (к югу от Рима) занят войсками союзников.

# Разбойнікі адказуць за свае злачынствы

Звярынай жорсткасцю, масавым забойствам мірных, ні ў чым не вінаватых людзей азнаменавалі нямецкія акупанты сваё гаспадаранне ў Васілішкаўскім раёне Баранавіцкай вобласці.

У раёне цяжка знайсці вёску, дзе-б гітлераўцы не пакінулі свой крывавы след, а некаторыя вёскі яны поўнасцю сцёрлі з твару зямлі. Некалі прыгожую вёску Агародзішча, Сабакінскага сельсовета, немцы спачатку аграбілі, а потым усю спалілі, учыніўшы дзікую расправу над яе жыхарамі. Яны забілі там 130 чалавек, сярод іх — дзеці, жанчыны, старыкі. Толькі ў м. Васілішкі і 10 вёсках гэтага раёна немцы расстралялі і замучылі 1821 чалавека, разбурылі сотні сялянскіх гаспадарак. У канцы 1943 года нямецкія ізвергі падверглі бамбардыроўцы рад вёсак. Толькі ў Зубраве, Васілішкаўскага раёна, у Салтанішках і Дубічах, Радуньскага раёна бамбардыроўкай нямецкай авіяцыі знішчана звыш 80 сялянскіх двароў.

Расстрэламі і пажарамі нямецкія захопнікі хацелі запалохаць наш народ, зламаць у яго волю да супраціўлення. Але гэта не выйшла. Сотні жыхароў нашага раёна паўсталі са зброяй на свяшчэнную помсту нямецкім захопнікам. Аб'яднаўшыся ў партызанскія атрады народныя мсціўцы бязлітасна знішчаюць фашысцкую гадзіну на роднай зямле. Ад іх рук сотні нямецкіх захопнікаў і іх прыслужнікаў знайшлі смерць.

Адначасова са ўзброенай барацьбой, партызаны і ўсё насельніцтва нашага раёна вядуць учот усіх злачынстваў, тварымых немцамі і іх халуямі — паліцэйскамі. І недалёк той час, калі злодзеі-немцы і іх прыхвасні адкажуць за ўсе свае злодзеянні.

Піліп Васілішкаўскі.

Рэдкалегія.